# ВІНШАВАЛЬНАЕ СЛОВА ДЭКАНА ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА
## Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
## Сяргея Аляксандравіча ВАЖНІКА



Дарагія сябры, адзінадумцы-філфакаўцы!

У лістападзе 2024 г. філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта адсвяткуе сваё 85-годдзе. З гэтай нагоды чарговы выпуск навукова-асветніцкага часопіса «Сафія» прысвечаны нашаму слаўнаму юбіляру.

За 85 гадоў колькі дарог прывяло на родны факультэт! Колькі людзей дакранулася да святога грааля класічных ведаў! Колькі лёсаў вырашыла філалагічная «крывая»! А можа для некаторых і «прамая» – непасрэдна на яго вялікасць Факультэт роднай мовы і прыгожага пісьменства!

У кожнага свой філфак, са сваім пантэонам любімых выкладчыкаў. Светлая памяць тым, каго ўжо няма з намі і на кім да сённяшняга часу трымаецца веліч і слава філалагічнай адукацыі ў нашай краіне.

Пераемнасць традыцый і пакаленняў… Як вядома, мова і літаратура выкладаюцца ў БДУ з 1921 года – года заснавання нацыянальнага ўніверсітэта. Першыя выкладчыкі-філолагі… Хто яны? Што выкладалі? Хочацца зазірнуць у тыя легендарныя часы, пасядзець на лекцыях выкладчыкаў-пачынальнікаў, паразмаўляць з тагачаснымі студэнтамі… На жаль, няма зараз такой мажлівасці. У архівах засталіся толькі лічбы, імёны і прозвішчы. Некаторыя з іх дастаткова знакавыя і прэцэдэнтныя.

Адным з першых выкладчыкаў быў Якуб Колас, якога інакш як дзядзька Колас ці бацька Колас не называлі. У кнізе выпускніка літаратурна-лінгвістычнага аддзялення педагагічнага факультэта БДУ (1928–1930) М. Лужаніна «Колас расказвае пра сябе» (Мінск, 1964) прыводзяцца наступныя словы класіка: *Жывіце даўжэй, хлопцы! Дагледзьце на свае вочы ўсё, чаго не давялося мне, і заўсёды помніце: хай кожны дзень ваш сябруе ці з пачаткам, ці з заканчэннем якой-небудзь справы.*

Спраецыруем гэтыя словы на родны факультэт. Дзядзька Колас на ўласныя вочы «дагледзеў» стварэнне ў 1939 годзе філалагічнага факультэта, яго эвакуацыю на станцыю Сходня пад Масквой на пачатку Вялікай Айчыннай вайны, яго пасляваеннае аднаўленне… А ўжо вучні Якуба Коласа «дагледзелі» яго росквіт у савецкія часы, калі факультэт лічыўся самым вялікім у БДУ: у 1960–1970-я гады на філфаку навучалася больш за 2 500 студэнтаў. Быў новы росквіт і ў 1990-я гады, калі адкрываліся новыя аддзяленні: «Славянскай філалогіі», «Класічнай філалогіі», «Рамана-германскай філалогіі», «Усходняй філалогіі»… Мне, студэнту-філолагу 1990-х, вельмі хочацца «сябраваць» з пачаткам многіх спраў, з якімі будзе асацыявацца сучасны філфак. Вельмі хочацца, каб факультэт развіваўся, але пры гэтым не забываўся на свае слаўныя традыцыі, сваю гісторыю, свае Імёны. Гэтаму прысвечаны многія публікацыі ў юбілейным нумары «Сафіі».

Са святам, родны філфак! Са святам, дарагія калегі!